НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

УДК 882.6 (092) Багдановіч + 882.6 – 1.09

**Вабішчэвіч**
**Таццяна Іванаўна**

# МАКСІМ БАГДАНОВІЧ
# І СТАНАЎЛЕННЕ
# НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЭТЫЧНАЙ ТРАДЫЦЫІ

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 - беларуская літаратура

Мінск, 2007

Праца выканана ў Дзяржаўнай навуковай установе "Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі"

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік: | **Жураўлёў Васіль Пракопавіч**, доктар філалагічных навук, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела беларускай літаратуры XX ст. Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі |
| Афіцыйныя апаненты: | **Штэйнер Іван Фёдаравіч**, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны |
| | **Багдановіч Ірына Эрнстаўна**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта |
| Апаніруючая ўстанова: | **Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка** |

Абарона адбудзецца 25 красавіка 2007 года ў 14.30 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.41.01 пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі (220072, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 66; e-mail: inlit@bas-net.by; тэл. 284-15-31).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 15).

Аўтарэферат разасланы 23 сакавіка 2007 года

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат філалагічных навук А.У. Бразгуноў

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі.** Тэма работы адпавядае прыярытэтнаму кірунку фундаментальных даследаванняў "Беларуская літаратура і літаратуразнаўства ў фарміраванні духоўна-маральнага свету сучаснага чалавека" (Пастанова Савета міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17.05.2005 г. № 512), а таксама бягучым і перспектыўным планам дзейнасці ДНУ "Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі". Даследаванне праведзена ў межах планавай тэмы аддзела беларускай літаратуры ХХ ст. Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі "Праблемы этыкі і эстэтыкі ў беларускай літаратуры ХХ ст.", уключанай у ДПФД "Беларуская мова і літаратура" і зацверджанай пастановай Прэзідыума НАН Беларусі № 94 ад 05.07.2001 г. Тэма дысертацыі зацверджана Навуковым саветам Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі (пратакол № 9 ад 14.12.2004 г.).

**Мэта і задачы даследавання.** Мэта дысертацыйнага даследавання – вызначыць ролю і месца комплексу літаратурна-тэарэтычных ідэй і творчых напрацовак Максіма Багдановіча ў станаўленні беларускай паэтычнай традыцыі як прафесійнай мастацкай сістэмы агульнанацыянальнага і сусветнага значэння.

Для дасягнення дадзенай мэты неабходна вырашыць наступныя **задачы**:

— выявіць уплыў узаемасувязяў у сістэмах "аўтар – твор – чытач", "беларуская літаратура – грамадства" ў пачатку ХХ стагоддзя на складванне такога літаратурнага феномена, як нацыянальны класічны стыль, дасягненне айчынным паэтычным словам класічнага мастацкага ўзроўню;

— вызначыць спецыфіку ўзаемадзеяння М.Багдановіча з "нашаніўскім" сацыяльна-культурным і ідэйна-мастацкім кантэкстам праз аналіз паэтычнай і літаратурна-крытычнай спадчыны творцы як мастацка-інтэлектуальнай цэласнасці, што мае сваё канцэптуальнае ядро і ідэйныя складнікі;

— раскрыць значэнне ідэй і творчых напрацовак М. Багдановіча для ўмацавання анталагічна-мастацкіх і інтэлектуальных асноў беларускай паэтычнай традыцыі;

— акрэсліць этапы складвання нацыянальнага класічнага стылю, шляхі, па якіх ішло афармленне беларускай паэзіі ў паўнавартасны эстэтычны феномен і дзейсны суб'ект еўрапейскай прафесійнай літаратурна-мастацкай прасторы.

Адпаведна пастаўленым мэце і задачам у якасці **аб'екта** даследавання вылучаецца нацыянальная паэтычная традыцыя на этапе яе станаўлення ("нашаніўскі" перыяд), матэрыялізаваная ў мастацкіх, а таксама літаратурна-тэарэтычных, крытычных, публіцыстычных тэкстах беларускіх аўтараў (Цёткі, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, А. Гаруна, С. Палуяна, В. Ластоўскага,

М. Гарэцкага, З. Бядулі і інш.). Выбар аб'екта даследавання абумоўлены тым, што істотныя для раскрыцця тэмы дысертацыі характарыстыкі беларускага літаратурна-мастацкага жыцця перыяду афармлення сучаснай паэтычнай традыцыі (аўтанамізацыя паэтычнага мастацтва, умацаванне эстэтычнай самасвядомасці айчыннай вершатворчасці, выпрацоўка нацыянальнага класічнага стылю і універсальнай чытацка-рэцэптыўнай парадыгмы) найбольш выразна прасочваюцца пры супастаўленні ўласна мастацкіх з'яў з тымі ацэнкамі, устаноўкамі, якія агучваліся ў рэфлексіўна-крытычных тэкстах як своеасаблівай метамове паэтычнага мастацтва. Прадмет даследавання – сукупнасць літаратурна-тэарэтычных і эстэтычных ідэй Максіма Багдановіча, іх праявы ў функцыянаванні нацыянальнай паэтычнай традыцыі.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. На пачатку XX ст. тэмпы і кірункі руху айчыннай паэзіі да класічнага ўзроўню, анталагічна-мастацкай універсальнасці і агульнаеўрапейскай духоўна-эстэтычнай значнасці ў істотнай ступені абумоўліваліся спецыфікай сацыяльна-культурнай сітуацыі, у якой адбывалася станаўленне нацыянальнай паэтычнай традыцыі. Сацыяльныя фактары ўплывалі не толькі непасрэдна на склад і колькасць беларускай пісьменніцкай і чытацкай аўдыторый, але і на змястоўна-тэматычныя і стылёвыя характарыстыкі "нашаніўскай" паэзіі, у тым ліку – на прынцыпы выбудоўвання мастацкай камунікацыі ("аўтар – твор – чытач"), ад якіх наўпрост залежалі магчымасці пераадолення лакальнасці, вузка-сялянскай скіраванасці беларускамоўнай творчасці.

2. У гісторыі беларускай паэзіі творчая спадчына Максіма Багдановіча стварае яскравы прэцэдэнт наватарства – канструктыўнага адмаўлення традыцыі, парушэння канона, праз якое сама традыцыя (рухомая эстэтычная сістэма) сцвярджае свой развіццёвы патэнцыял і якое, адпаведна, выступае найбольш дзейсным механізмам літаратурнай эвалюцыі. Багдановіч свядома пайшоў насуперак беларускай сацыяльна-культурнай сітуацыі і мастацкім стандартам пачатку XX стагоддзя, паспрыяўшы ўнутранай пераарганізацыі традыцыі яшчэ на этапе яе станаўлення – у перыяд выпрацоўкі нацыянальнага класічнага стылю. Дасягненні паэта ў галіне вершатворчасці і літаратурнай крытыкі прадвызначылі шляхі і істотна паскорылі працэс афармлення беларускай паэзіі ў цэласны нацыянальна-адметны эстэтычны феномен, арганічна ўключаны ў еўрапейскую культурную прастору.

3. Найбольш поўна выявіць значэнне творчасці Максіма Багдановіча для нацыянальнай паэтычнай традыцыі магчыма толькі пры ўмове разгляду паэтавай мастацкай практыкі ва ўзаемасувязі з яго навукова-крытычнай дзейнасцю: у сукупнасці яны ўяўляюць сабой цэласную ідэйна-эстэтычную

праграму, скіраваную на развіццё беларускай паэзіі, замацаванне і пастаяннае падтрыманне за ёй статусу дзейснага суб'екта агульнаеўрапейскага літаратурнага працэсу. Сутнаснае ядро Багдановічавай праграмы складае канцэпцыя еўрапеізацыі беларускага мастацкага слова, дзе паэтам упершыню абгрунтаваныя асновы бытавання нацыянальнай паэзіі ў "вялікім часе", у сацыяльна-культурнай прасторы Беларусі і свету, а таксама закладзеная ідэя прынцыповай адкрытасці нацыянальнай паэтычнай традыцыі, шматвектарнасці яе мастацкага развіцця. Мастацка-анталагічны характар, інтэлектуальна-эстэтычная цэласнаць і універсальнасць, праграмнасць і скіраванасць на перспектыву абумовілі фундаментальны ўплыў напрацовак М. Багдановіча на станаўленне беларускай паэзіі.

4. Ступень уключанасці рэпрэзентаваных М. Багдановічам ідэй у паэтычную практыку і аналітыка-крытычнае літаратурнае мысленне пачатку XX ст. пазначае паслядоўную змену этапаў складвання нацыянальнага класічнага стылю, прафесійнага сталення айчыннай паэзіі: падрыхтоўчага (раннеэстэтычнага, дакрытычнага) (1905–1908 гг.), цэнтральнага (1909–1913 гг.) і завяршальна-замацавальнага (1914–1918 гг.). Трохфазная перыядызацыя "нашаніўскай" пары з большай дакладнасцю і аб'ектыўнасцю, чым дзвюхфазная (калі ў якасці мяжы разглядаліся 1909 г. ці 1913 г.), адлюстроўвае працэс росту айчыннага паэтычнага слова са з'явы эстэтычна несвядомай, паралітаратурнай, лакальна-значнай у паўнавартасны феномен прафесійнага літаратурнага мастацтва, чыннік нацыянальнага і агульнасусветнага духоўна-інтэлектуальнага жыцця.

**Асабісты ўклад дысертанта.** Работа ўяўляе сабой арыгінальнае аўтарскае даследаванне, у поўным аб'ёме выкананае дысертантам самастойна. Артыкулы, у якіх апублікаваны вынікі дысертацыі, напісаны без сааўтараў.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Вынікі дысертацыйнага даследавання выкладаліся і абмяркоўваліся на 14 міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях і чытаннях: Навуковыя чытанні, прысвечаныя 80-годдзю з дня нараджэння М.М. Грынчыка (Мінск, 19 лістап. 2003 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Я не самотны, я кнігу маю…", прысвечаная 90-годдзю адзінага прыжыццёвага зборніка вершаў М. Багдановіча "Вянок" (Мінск, 8 снеж. 2003 г.); Рэспубліканская навуковая канферэнцыя "Актуальныя праблемы сучаснага літаратурнага працэсу" (Мінск, 31 мая 2004 г.); Рэспубліканская навуковая канферэнцыя "Каласавіны-2004" (Мінск, 3 лістап. 2004 г.); Рэспубліканскія юбілейныя навуковыя чытанні, прысвечаныя 80-годдзю з дня нараджэння акадэміка НАН Беларусі, народнага пісьменніка І.Я. Навуменкі (Мінск, 22 лют. 2005 г.); Міжнародная канферэнцыя маладых навукоўцаў "Моладзь у навуцы – 2005" (Мінск, 14–18 лістап. 2005 г.);

Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Максім Багдановіч – празаік, крытык, публіцыст" (Мінск, 29 лістап. 2005 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя "Руская і беларуская літаратуры на мяжы XX–XXI ст." (Мінск, 25–27 красав. 2006 г.); Рэспубліканская навуковая канферэнцыя "Сучасны літаратурны працэс: пісьменнік і жыццё" (Мінск, 11 мая 2006 г.); Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні (Гродна, 11–12 мая 2006 г.); IV архіўныя чытанні, прысвечаныя 100-годдзю газеты "Наша ніва" і 100-годдзю заснавання беларускага выдавецкага таварыства "Загляне сонца і ў наша аконца" (Мінск, 6 кастр. 2006 г.); Міжнародная канферэнцыя маладых навукоўцаў "Моладзь у навуцы – 2006" (Мінск, 16–18 кастр. 2006 г.); Рэспубліканская навуковая канферэнцыя "Каласавіны-2006" (Мінск, 3–4 лістап. 2006 г.); Рэспубліканская навукова-тэарэтычная канферэнцыя "Беларусь у эпоху рэвалюцыйных узрушэнняў: да 100-годдзя выхаду ў свет газеты "Наша ніва" (Мінск, 10 лістап. 2006 г.). Дысертацыя двойчы абмяркоўвалася на пасяджэннях аддзела беларускай літаратуры XX ст. Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі (пратаколы № 3 ад 12.07.2006 г.; № 5 ад 26.12.2006 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Вынікі дысертацыйнай работы адлюстраваны ў 14 публікацыях (з іх – 5 навуковых артыкулаў у рэцэнзаваных перыядычных выданнях (2,45 друк. арк.), 2 навуковыя артыкулы ў зборніках (1,86 друк. арк.), 7 матэрыялаў канферэнцый). Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 6,9 друк. арк.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Структура даследавання вызначаная мэтай і задачамі работы. Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, двух раздзелаў, заключэння і бібліяграфічнага спісу. Агульны аб'ём працы – 119 старонак, з іх асноўны тэкст даследавання – 103 старонкі, бібліяграфічны спіс – 16 старонак (223 пазіцыі).

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **Уводзінах** абгрунтоўваецца навуковая і сацыяльна-культурная актуальнасць тэмы даследавання, раскрываецца метадалагічная адметнасць працы ў параўнанні з папярэднімі даследаваннямі, прысвечанымі творчасці М. Багдановіча. Адзначаецца, што дасягнуць пастаўленай у дысертацыі мэты – значыць з пазіцый сённяшняга дня акрэсліць месца М. Багдановіча ў "нашаніўскім" літаратурным працэсе і сістэме беларускага паэтычнага слова наогул.

У першым раздзеле **"Нашаніўскі" перыяд як эпоха складвання нацыянальнай літаратурнай класікі"** на аснове аналізу ўзаемадзеяння ў сістэмах "аўтар – твор – чытач", "літаратура – грамадства" выяўлены праблемы

складвання нацыянальнага класічнага стылю ў беларускіх сацыяльна-культурных умовах пачатку XX ст., акрэслены некаторыя змястоўна-стылёвыя асаблівасці "нашаніўскай" паэзіі, абумоўленыя спецыфікай сацыяльнага складу айчыннай чытацкай і аўтарскай аўдыторый, прасочаны акалічнасці ўключэння М. Багдановіча ў літаратурна-мастацкі працэс, ахарактарызаваны спосабы арганізацыі мастацкай камунікацыі, актуалізаваныя ў беларускай паэтычнай прасторы Багдановічам.

У падраздзеле 1.1 **"Сацыяльны выклік паэтычнаму слову: станаўленне беларускай класічнай паэзіі і праблема чытача"** абгрунтоўваецца думка, што беларуская класічная паэзія фарміравалася ва ўмовах, якія можна акрэсліць як сацыяльны выклік паэтычнаму слову. Даследчыкі (А. Луцкевіч, М. Гарэцкі, пазней – С. Александровіч, Р. Бярозкін, Л. Гаранін, У. Гніламёдаў, В. Каваленка, У. Конан, А. Лойка, І. Навуменка, М. Тычына і інш.) неаднойчы адзначалі ўзаемазалежнасць паміж станаўленнем беларускай літаратуры і станаўленнем беларускай нацыі на пачатку XX ст. Аналіз механізмаў узаемадзеяння ў сістэме "аўтар – твор – чытач" дазваляе раскрыць яшчэ адзін аспект гэтай узаемазалежнасці. Сутнасць сітуацыі сацыяльнага выкліку паэтычнаму слову заключаецца ў наступным: сацыяльна-палітычныя зрухі 1905–1907 гг. нарадзілі беларускага чытача, спрыялі ўзнікненню попыту на беларускамоўную літаратурную прадукцыю і гуртаванню чытацкай аўдыторыі, аднак нацыянальны рэцыпіент па аб'ектыўных гістарычных прычынах (адсутнасць беларускай інтэлектуальнай эліты і "высокай", кніжнай культуры) паўставаў як рэцыпіент "нізкі", "просты", "мужыцкі" і, адпаведна, меў вельмі спецыфічныя запатрабаванні, далёкія ад тых, што дзейнічаюць у дачыненні да літаратуры класічнага ўзроўню.

Рэканструкцыя гарызонта чаканняў "шараговага" рэцыпіента, якую дазваляюць зрабіць матэрыялы "Нашай нівы" (рубрыкі "З Беларусі і Літвы", "Паштовая скрынка" і інш.), выяўляе два "вузкія месцы" ва ўспрыманні мастацкага тэксту эстэтычна непадрыхтаваным, неразвітым чытачом. Па-першае, рэцыпіент-селянін, узгадаваны пераважна на грунце фальклору ў замкнутым вясковым асяроддзі, чуйна ўспрымаў функцыянальную эстэтыку слова (у тым ліку своеасаблівага кшталту вобразнасць, іншасказальнасць, уласцівыя народнай творчасці), па-другое, шукаў у творы праўдападабенства, натуралістычнасці, угрунтаванасці зместу паэзіі ў аб'ектыўную рэчаіснасць (калі ў героях можна пазнаць сябе, а ў апісаных абставінах – сваё непасрэднае атачэнне, умовы жыцця).

Канцэптуалізацыя "мужыцкага" адрасата, характэрная для ранняга "нашаніўства", непазбежна адбівалася на мастацка-інтэлектуальным узроўні лірыкі 1905–1908 гг.: аўтары арыентаваліся на рэцэптыўныя чаканні чытача-селяніна, і гэта накладала пэўныя абмежаванні на тэмпы эстэтычнага росту маладой літаратуры, перад якой, апроч уласна мастацкіх задач, востра стаяла

яшчэ і задача "ўзгадавання культурнага пакалення беларусаў" (А. Луцкевіч). На пачатку XX ст. беларуская паэзія, па сутнасці, аказвалася ў становішчы паміж двух агнёў – матэрыяльнымі законамі сацыяльнай рэчаіснасці і нематэрыяльнымі законамі мастацтва. З аднаго боку, у тагачасных умовах ствараць і спажываць літаратуру маглі толькі самі прадстаўнікі заняпалага, нядаўна ўзнятага на шлях "з цемры да святла" народа – іначай літаратура не была б нацыянальнай, беларускай; з другога боку, існавала падпарадкаваная ўнутрымастацкім законам патрэба ў тэрміновым і якасным вырашэнні ўласна эстэтычных задач (распрацоўка розных стылявых пластоў мовы, у тым ліку і высокага, развіццё жанравай сістэмы, ідэйна-тэматычнае ўзбагачэнне, паглыбленне псіхалагізму і інш.). Беларускае пісьменства дало сусветнай літаратуры рэдкі ўзор складвання "высокай", класічнай паэзіі для нацыянальнага нізавога ці сярэдняга чытача – пры амаль поўнай адсутнасці чытача элітнага, адукаванага. Для развітых еўрапейскіх літаратур такая сітуацыя нетыповая: стварэнне мастацкага слова, даступнага для "простага" рэцыпіента, з'яўлялася тут толькі адной з асобных, функцыйна самастойных ліній мастацкага развіцця, якая ўзнікала на пэўным этапе эвалюцыі пісьменства і мала перакрыжоўвалася з рэчышчам "высокай" творчасці – класічнай асновай літаратуры (напрыклад, праблема "кнігі для народу" паўстала ў рускай літаратуры ўжо пасля "пушкінскай" пары).

Безумоўна, многія беларускія аўтары выдатна ўсведамлялі пагрозу, якую несла беларускаму паэтычнаму слову канцэптуалізацыя "мужыцкага" адрасата (выказванні С. Палуяна пра патрэбу больш "навучнай часопісі", чым "сялянская" "Наша ніва" ("Лісты з Украіны") і інш.). Напрыканцы першага дзесяцігоддзя XX ст. наспела вострая патрэба скарэктаваць камунікатыўную накіраванасць маладой літаратуры, што дазволіла б умацаваць эстэтычны і інтэлектуальны пачаткі нацыянальнай вершатворчасці.

У падраздзеле 1.2 **"Феномен "песняроў"-самавукаў і змястоўна-стылёвыя асаблівасці беларускай паэтычнай класікі"** фокус даследчай увагі пераносіцца з чытача на аўтара; сцвярджаецца, што паколькі па шэрагу сацыяльна-культурных прычын асноўнай літаратурагенеруючай сілай на пачатку XX ст. выступілі выхадцы "з нізоў", аўтары-самавукі, якія не мелі сістэмнай адукацыі, многія ўзоры "нашаніўскай" паэзіі, асабліва 1906–1908 гг., выяўляюць прыкметы паэтыкі інсіта (ад. лац. insitus – прыродны, несфармаваны, арыгінальны; тэрмін Ш. Ткача), нясуць на сабе адзнакі "штодзённай (трэцяй) культуры" (В. Пракоф'еў).

Творца-прафесіянал і творца-самавук рэпрэзентуюць два адрозныя тыпы мастацкай свядомасці, а, значыць, і стаўлення да мэтаў, задач, прыёмаў, сродкаў мастацкай творчасці. "Трэцяя культура" ("штодзённая" культура – паколькі ствараецца і функцыянуе ў нізавым асяроддзі, задавальняючы эстэтычныя патрэбы "простай", слабаадукаванай, неабазнанай у тонкасцях

мастацтва аўдыторыі) займае прамежкавае становішча паміж, з аднаго боку, "высокім", заснаваным на акадэмічных нормах, школьнай адукацыі прафесійным мастацтвам і, з другога боку, фальклорам – калектыўнай, "стыхійнай" крэатыўнасцю.

Для Беларусі праблема агульнаадукацыйнага і літаратурна-мастацкага самавуцтва заснавальнікаў сучаснай літаратурнай традыцыі набыла вельмі спецыфічнае гучанне: на пачатку XX ст. носьбіты беларускасці – сяляне – рэпрэзентавалі тып чалавека, узгадаванага пераважна ў ментальна-эстэтычнай парадыгме традыцыйнай культуры, і кніжная адукацыя выступала ў такім разе як прыўнесеная звонку, у пэўным сэнсе чужародная (прычым не толькі паводле мовы). У канцы XIX – пачатаку XX ст. на Беларусі суіснавалі два прынцыпова адрозныя тыпы сацыяльна-культурнага ўладкавання: урбаністычна-індустрыяльная мадэрная цывілізацыя (з характэрнай для яе высокай інтэнсіўнасцю камунікатыўных працэсаў, наяўнасцю корпусу абавязковых для засваення пісьмова зафіксаваных (кніжных) ведаў, што складаюць нормаўтваральную базу жыццядзейнасці мадэрнага чалавека) і культура традыцыйнага кшталту (заснаваная на вуснай трансляцыі сацыяльна значнай інфармацыі і арыентаваная на своеасаблівую герметычнасць, малую мабільнасць соцыуму). Беларускі народны інтэлігент валодаў кодамі абедзвюх культурных сістэм (традыцыйнай этнічнай і мадэрнай, "цывілізаванай", якая ў іншамоўнай (польскай або рускай) абалонцы засвойвалася праз адукацыю) і меў унікальную магчымасць ажыццявіць медыяцыю беларускіх этнічных каштоўнасцей у мадэрны свет. Толькі ў такім выпадку аўтэнтычна беларускае атрымлівала гістарычную перспектыву. Задача мадэрнізацыі беларускасці, стварэння нацыянальнай мадэрнай прасторы легла на плечы дзеячоў, згуртаваных вакол газеты "Наша ніва".

Мастацкая творчасць "нашаніўцаў"-самавукаў, якім суджана было заснаваць новую нацыянальную літаратуру, зрабіцца паэтамі-прафесіяналамі, дае багаты матэрыял для ілюстрацыі працэсаў барацьбы і ўзаемадзеяння "нізкай" ("штодзённай") і "высокай", традыцыйнай і "цывілізацыйнай" культурных парадыгм у полі нацыянальнага паэтычнага дыскурсу. Маладая беларуская літаратура павінна была вынайсці адпаведныя формы для выяўлення свайго "нізкага" аб'екта, і яе шлях да "высокай" прафесійнасці ляжаў праз "штодзённасць" – пераасэнсаванне патэнцыялу інсітнага мастацтва.

Прыродаапісальная лірыка Я. Купалы (вершы "Вясна" (1906), "Лета" (1907) і інш.) і Я. Коласа ("На полі вясною" (1908), "Да вясны" (1911) і інш.), іншых аўтараў-"нашаніўцаў" (Старога Уласа (тыповага інсітніка), К. Буйло, І. Дзежкі, Я. Журбы, К. Каганца, В. Каршуна, Г. Леўчыка, А. Паўловіча і інш.) дазваляе прасачыць сувязь паэтыкі класікаў і шарагоўцаў са сферай інсіта: абагульненасць перададзенага ўражання, скупасць і аднастайнасць тропаў,

апавядальнасць, прадметнасць, а-суб'ектыўнасць выказвання, выкарыстанне ходкіх характарыстык з'явы, моўных шаблонаў, апора на "калектыўную" эмоцыю ("пункт погляду мас", паводле В. Івашына). На інсітным мастацкім патэнцыяле ў "нашаніўскай" паэзіі 1906–1910 гг. склаўся своеасаблівы тып эстэтычнага асваення рэчаіснасці, які можна назваць шчыра-простым. Істотна, што хаця інсітнае і прафесійнае суіснавалі на пачатку XX ст. у адной прасторы, мелі агульную "крывяносную сістэму", паэты – будучыя класікі – былі здольныя размяжоўваць сферы фальклорнага, інсітнага, прафесійнага, адчуваючы іх розную энергетыку і функцыянальныя магчымасці (у ранняга Я. Купалы, напрыклад, знаходзім вершы, паслядоўна вытрыманыя ў духу "высокай", "кніжнай" паэзіі ("Мая малітва" (1906), "Пакіньма напуста на лёс свой наракаць…" (1906), "Да N." (1906), "З маркотных думак…" (1907) і інш.). Цеснае ўзаемадзеянне з мастацтвам інсіта шмат у чым абумовіла такую самабытна-каштоўную рысу беларускай класічнай паэзіі, як знешняя, уяўная прастата.

У падраздзеле 1.3 **"Актуалізацыя праблем універсалізму і эстэтычнай самасвядомасці нацыянальнай вершатворчасці"** абгрунтоўваецца выснова, што ў 1908–1909 гг. у беларускай паэтычнай прасторы наспеў пераломна-крызісны момант: разгортванне літаратурнага працэсу за кошт магчымасцей аўтараў-самавукаў, "песняроў з волі Божай" не толькі паспрыяла кансалідацыі нацыянальнай чытацка-аўтарскай аўдыторыі, але і агаліла шэраг прынцыповых праблем (тэхнічная слабасць вершаў, недапраяўленасць эстэтычнай самасвядомасці літаратуры, вымушаная абмежаванасць стылёва-змястоўных прыярытэтаў прыгожага пісьменства рамкамі "штодзённай" культуры, сялянскасці, дамадэрнасці), нявырашанасць якіх пагражала "ізаляцыяй ад будучыні". Патрабавалася распрацоўка новай моўнай стыхіі – універсальна "высокай", агульначалавечай, вольнай ад рудыментаў простанароднасці.

Ініцыятарам культурна-мастацкіх пераменаў стаў С. Палуян, які ў сваіх публіцыстычных артыкулах ("З нашага жыцця") сфармуляваў ключавыя ідэі мадэрнізацыйнага праекту: "з мовы цёмных сялян выкаваць мову культурнай нацыі", "не хавацца з ёю (мовай. – *Т. В.*) па хатніх кутах, а ў свет шырокі вынасіць". Патрабуючы ўвагі да "інтэлігенцкага" складніку нацыянальнага руху, Палуян настойліва падкрэсліваў, што ад гэтага залежаць далёкасяжныя гістарычныя перспектывы – выпрацоўка "высокай" (адпаведнай "цывілізацыйным" патрабаванням XX ст.) беларускай культуры і літаратуры.

Уваходжанне М. Багдановіча ў нацыянальную паэзію і ўзніклы ў сувязі з гэтым "канфлікт інтэрпрэтацый" (адпраўка вершаў паэта "ў архіў" як неадпаведных беларускай літаратурнай сітуацыі, "не-для-народных") ярка высвецілі пераломнасць моманту, маючае месца сутыкненне дзвюх мадэляў літаратурнага развіцця: з аднаго боку, устаялай на той час у "нашаніўскім" пісьменстве народніцка-сялянскай праграмы з інтэгральнай увагай на пытаннях

сацыяльнага быцця беларусаў і з паэтыкай, гранічна набліжанай да "масавага", народнага светаўспрымання; з другога боку, новай для "нашаніўства" універсальна-эстэтычнай, сацыяльна нейтральнай мадэллю мастацкай усеахопнасці, заснаванай на "высокай" прафесійнай паэтыцы ва ўсёй яе разнастайнасці і складанасці. Першая мадэль, запачаткаваная ў беларускай паэзіі яшчэ Ф. Багушэвічам, рэпрэзентавала голас "пакрыўджанага", што ўпершыню суб'ектывізаваў сябе ў свеце, адкрываў для сябе рэчаіснасць і сябе ў гэтай рэчаіснасці. Сацыяльна маркіраваная мастацкая прастора "нашаніўскай" паэзіі 1906–1909 гг. разгортвалася пераважна ў рамках дыялогу "пакрыўджаны – пакрыўджанаму" або "пакрыўджаны – крыўдзіцелю" (што знаходзім у большасці ранніх вершаў Я. Купалы і Я. Коласа, дзе як імпліцытны аўтар, так і імпліцытны чытач належаць да "нізоў" грамадства). Другая, універсальна-эстэтычная мадэль літаратурнага развіцця, яскрава прадстаўленая М. Багдановічам, засноўвалася на універсальным, "агульнакультурным" спосабе выбудоўвання мастацкай прасторы па прынцыпе "зварот мадэрнай (высокаадукаванай, "цывілізаванай", "уключанай" у культуру) асобы да мадэрнай асобы".

Паварот да азначанай мадэлі развіцця – рух у кірунку рэцэптыўнай універсалізацыі тэксту і ўскладнення яго формавых прыкмет, дыверсіфікацыі змястоўна-тэматычнага дыяпазону, індывідуалізацыі мастацкага мыслення, а таксама творчай самакрытычнасці, "самаўсведамлення" – адбываецца ў другой палове 1909 г. у дзейнасці Я. Купалы (вершы "Зваяваным", "Прад світаннем", "Адцвітанне", "Снег" і інш.). У 1909–1910 гг. творчае абнаўленне перажывае таксама Я. Колас. Пералом у бок універсалізму праявіўся ў Коласа найперш у выспяванні ліра-эпасу (праца над "Новай зямлёй", "Сымонам-музыкам"). Беспрэцэдэнтным паказчыкам якасных зменаў у эстэтычнай прасторы нацыянальнага мастацкага слова можна лічыць таксама складванне новай рэцэптыўна-ацэначнай парадыгмы. Заўвагі "нашаніўцаў" пра дасланыя ў рэдакцыю газеты вершы (1910, № 35, № 50, рубрыка "Паштовая скрынка") набываюць канцэптуальнае ў плане разумення эстэтычнай сутнасці паэтычнага слова гучанне. Гэта ўжо не проста ўказанне на тэхнічныя недахопы ("няма рытму"), а прафесійна-універсальныя патрабаванні высокай якасці і духоўна-мастацкай сталасці паэтычнай прадукцыі – без скідак на народнае паходжанне аўтараў ці маладосць літаратурнай традыцыі.

Ствараючы "высокую", узорна-класічную паэзію ў неспрыяльных для гэтага ўмовах, М. Багдановіч свядома ішоў насуперак гістарычным абставінам, пераадольваў негатыўныя бакі ўплыву фактараў сацыяльнага выкліку паэтычнаму слову і "песняроў"-самавукаў. Каардынаты, зададзеныя творцам-наватарам (лірызацыя, індывідуалізацыя, эстэтызацыя і інтэлектуалізацыя паэтычнай мовы, "акультурванне" і універсалізацыя мастацкай прасторы, рацыянальнае стаўленне да вершаванага радка), шмат у чым прадвызначылі рух

нацыянальнай паэтычнай традыцыі да класічнага ўзроўню, інтэнсіфікавалі эстэтычны і прафесійны рост айчыннага вершаскладання.

У другім раздзеле **"Эстэтычна-інтэлектуальнае поле Максіма Багдановіча: трываласць мастацкіх прынцыпаў і новыя перспектывы нацыянальнай паэзіі"** праз разгляд спадчыны паэта-тэарэтыка як ідэйна-эстэтычнай праграмы па развіцці беларускага паэтычнага слова ўскрываюцца анталагічныя чыннікі афармлення феномена прафесійнай традыцыі – нацыянальна маркіраванай, самаразвіццёвай мастацкай сістэмы; прасочваюцца лініі ўзаемадзеяння М. Багдановіча – ідэолага літаратурнага развіцця – з "нашаніўскім" мастацкім і ідэйна-тэарэтычным кантэкстам, акрэсліваюцца механізмы ўплыву творцы на станаўленне айчыннай паэтычнай традыцыі, вызначаюцца этапы мастацка-прафесійнага сталення нацыянальнай паэзіі.

У падраздзеле 2.1 **"Творчасць Максіма Багдановіча як ідэйна-эстэтычная праграма"** падкрэсліваецца, што пры ўсёй знешняй разнастайнасці і шматпланавасці Багдановічавых мастацкіх і літаратурна-крытычных пачынанняў у аснове паэтавай дзейнасці ляжыць ідэя вывядзення беларускага вершаванага слова на ўзровень дзейсна-ўплывовага суб'екта сусветнай (у першую чаргу еўрапейскай) мастацкай прасторы. Рацыянальна-аналітычны падыход да творчасці дазволіў М. Багдановічу з прафесійнай дакладнасцю вызначыць найбольш праблемныя ўчасткі на шляху айчыннай паэзіі да класічнасці, універсальнасці і ў адпаведнасці з гэтым сфармуляваць задачы сваіх мастацкіх пошукаў, вызначыць тактыку і стратэгію паэтычнай дзейнасці. Ужо ў 1910–1911 гг. у паэта склалася шматузроўневая праграма па развіцці айчыннай паэзіі, наданні ёй "больш еўрапейскага выгляду". Творца артыкуляваў ідэю ўзгадавання беларускага "генія слова" (паводле ўспамінаў В. Ластоўскага), дасягнуць чаго можна праз культурную трансгрэсію беларускасці – распрацоўку агульначалавечых, значных у сусветным маштабе пытанняў духоўнасці. Перад нядаўна адроджанай літаратурай М. Багдановіч акрэслівае не проста задачу пераадолення другаснасці, нагнання агульнаеўрапейскага мастацкага працэсу: інтэнцыя "паставіць нашае нацыянальнае імя нараўне са ўсімі іншымі народамі свету" паказальная найперш сваёй наступальна-актыўнай сутнасцю. Для маладой паэзіі, якая ствралася пераважна самавукамі, "сілай з народу" (Л. Гмырак) (з усімі плюсамі і мінусамі, што адсюль вынікалі), агучаная М. Багдановічам задача набывала характар звышзадачы – літаратурна-культурнай праграмы-максімуму.

Аналіз артыкулаў "Глыбы і слаі", "За тры гады", "Забыты шлях", "Памяці Т.Г. Шаўчэнкі", "Грыцько Чупрынка" і інш., мастацкіх тэкстаў "Песняру", "Ліст да п. В. Ластоўскага", "Апокрыф", "Апавяданне аб іконніку і залатару" дазваляе вылучыць апорныя палажэнні-патрабаванні, што складаюць ідэйны каркас прапанаванай творцам праграмы развіцця айчыннай паэзіі: высокамастацкасць,

эстэтычная вартасць вершаванай прадукцыі, аўтаномнасць слоўнага мастацтва; індывідуалізаванасць стылю і зместу, "абасобленасць" таленту; усвядомленасць (рацыяналізм) творчай працы; няспынны творчы пошук, самаўдасканаленне, развіццё, рух наперад; пастаяннае суаднясенне дасягненняў нацыянальнай паэзіі са станам іншанацыянальных літаратур. Асэнсаваўшы шматстагоддзевы эстэтычна-філасофскі вопыт развітых еўрапейскіх пісьменстваў, М. Багдановіч у знятым выглядзе прынёс яго на беларускую глебу, абгрунтаваў у айчыннай культурнай прасторы базавыя прынцыпы функцыянавання прафесійнай літаратуры ў "малым" і "вялікім" часе. Паэт-тэарэтык закрануў прынцыповыя асновы слоўнага мастацтва, ускрыў анталагічную сутнасць паэзіі як адметнага віду духоўна-інтэлектуальнай дзейнасці чалавека.

У падраздзеле 2.2 **"Ідэі Максіма Багдановіча ў кантэксце фарміравання нацыянальнай паэтычнай класікі"** раскрываецца ўключанасць палажэнняў Багдановічавай праграмы па развіцці айчыннай паэзіі ў "нашаніўскі" культурна-адраджэнскі дыскурс, прасочваюцца шматстайныя водгукі і пераламленні, якія атрымалі напрацоўкі паэта ў літаратурна-мастацкім жыцці перыяду фарміравання нацыянальнага класічнага стылю.

У другім дзесяцігоддзі XX ст. у ідэях еўрапеізацыі-самабытнасці, выхаду на агульнасусветную арэну, набыцця беларускім пісьменствам сусветна-гістарычнага значэння адлюстраваўся прынцыповы вектар мастацкага жыцця краіны, акрэсліліся тэарэтычныя каардынаты, паводле якіх выбудоўваўся гмах нацыянальнай паэзіі. Ідэя адкрытасці да "чужога", немагчымасці і бесперспектыўнасці ізаляванага развіцця толькі ў "сваіх" вузкіх культурных межах, а таксама думка пра "ўсясветнае" значэнне "беларускай душы" як самакаштоўнага нацыянальна-адметнага феномена шырока абмяркоўваюцца "нашаніўцамі" ў 1909–1914 гг. ("Лісты з Украіны" С. Палуяна; "Куды ісці", "Ці маем права быць беларусамі?" І. М-скага; "Дзве мэты і іншае" М. Мінаева; "Не адным хлебам…" З. Бядулі; "Свайго не чурайцеся, чужому навучайцеся" Л. Гмырака і інш.). У гэтым сэнсе спроба М. Багдановіча стварыць вершы "беларускага складу" была своеасаблівым адказам на заклікі "нашаніўцаў" паказаць свету непаўторнасць, "чыстасць" (І. М-скі) беларускай душы.

Праблему еўрапеізацыі-самабытнасці можна назваць імпліцытным стрыжнем "нашаніўскай" дыскусіі 1913–1914 гг. Пастуляваныя М. Багдановічам ідэйна-эстэтычныя патрабаванні да мастацкай творчасці самым непасрэдным чынам перагукаюцца з заўвагамі, выказанымі ў "выбуховым" артыкуле Ю. Верашчакі (В. Ластоўскага) "Сплачвайце доўг". Ластоўскі звяртае ўвагу ў першую чаргу на тыя характарыстыкі паэтычнага слова, якія адказваюць за паспяховую рэпрэзентацыю беларускай паэзіі ў "вялікім" свеце (высокамастацкасць і інш.). Крытык фіксуе змену рэцэптыўнай парадыгмы беларускага пісьменства: вызначаць прыярытэты літаратурнага развіцця

пачынае "чытаючае і думаючае грамадзянства", нацыянальная інтэлігенцыя. Пра неабходнасць арыентавацца на сусветны інтэлектуальна-мастацкі ўзровень, задавольваць кнігай патрэбы як інтэлігенцыі, так і сялянства піша М. Гарэцкі ("Наш тэатр", "Развагі і думкі"). Падсумоўваючы вынікі дыскусіі, В. Ластоўскі фармулюе канцэптуальны заклік-устаноўку, сапраўдны літаратурны дэвіз "нашаніўства", у якім выразна прачытваецца ідэйная прысутнасць М. Багдановіча: "Мы павінны знайсці ў сябе і даць свету новыя думы, сказаць новае слова" ("Па сваім шляху!").

Абгрунтаваныя С. Палуянам, М. Багдановічам, В. Ластоўскім, М. Гарэцкім законы сталення нацыянальнай літаратуры, яе руху да духоўна-эстэтычнага ўзвышэння, стварэння "новага слова", лагічна супалі з законамі і "прыватнымі" тэндэнцыямі, паводле якіх ішло развіццё творчых індывідуальнасцей паэтаў-"младабеларусаў". Вершы са зборнікаў "Гусляр" ("Беззямельныя", "А як нам зоркі загаснуць…", "Песня і сіла" і інш.), "Шляхам жыцця" ("Выйдзі…", "Бледныя буднія дні", "Я ад вас далёка…", "Для зямлі прадзедаў маіх…", "Маладая Беларусь", "Песня мая", "Брату беларусу" і інш.), паэма "Яна і я" сведчаць аб інтэнсіўных працэсах прафесіяналізацыі, эстэтызацыі, філасафізацыі і "ацывілізоўвання" паэтычнай мовы (у тым ліку праз змену статусу імпліцытнага аўтара і чытача) у Я. Купалы на пачатку другога дзесяцігоддзя XX ст. Па шляху пошукаў "новай зямлі" і "новага неба" – апявання-ўзвышэння і грунтоўнага, энцыклапедычнага асэнсавання нацыянальнага быцця, хараства свету і чалавека разам з Я. Купалам ідзе ў другім дзесяцігоддзі XX ст. Я. Колас. Апошні найболей сярод аўтараў-класікаў скарыстаў з перспектыўных мастацкіх магчымасцей шчыра-простага тыпу эстэтычнага асваення рэчаіснасці (чысціня эмоцыі, прадметнасць, шырокае выкарыстанне апавядальна-гутарковых мадэляў, апора на народную мараль (раздзелы "Новай зямлі")). Упэўнена-стрыманае, без рыўкоў і падзенняў (як, напрыклад, у Я. Купалы) ці падкрэсленай, наступальна-актыўнай праграмнасці (як у М. Багдановіча) авалодванне універсалізмам пісьма прадэманстраваў у гісторыі беларускай паэтычнай традыцыі Алесь Гарун. Моцны анталагічна-філасофскі, агульначалавечы план твораў ("Паэту" і інш.), майстэрская перадача інтымна-сакральных, экзістэнцыйных перажыванняў ("Малітва", "Нічога на небе… І зоркі ніводнай…", "На смерць", "Nokturno", "Літанне адзіноце" і інш.) сведчылі пра мадэрна-еўрапейскі модус Гаруновай творчасці.

Акрэсленыя М. Багдановічам – паэтам, крытыкам і тэарэтыкам літаратуры – мастацкія заданні, па сутнасці, звязалі ў адзін вузел усе найбольш значныя пытанні фенаменалізацыі нацыянальнай паэзіі, "яўлення" яе айчыннаму і сусветнаму чытачу, суду гісторыі. Ідэя еўрапеізацыі беларускага паэтычнага мастацтва – стварэння "новага слова", прарыву ў будучыню – вызначыла каардынаты станаўлення нацыянальнай паэтычнай традыцыі на пачатку XX ст.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

## Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Станаўленне нацыянальнай паэтычнай традыцыі адбывалася ва ўмовах, якія можна акрэсліць як сацыяльны выклік паэтычнаму слову: востры попыт на духоўна-эстэтычныя каштоўнасці, што ўзнік на пачатку XX ст. у асяродку сялянства – галоўнага носьбіта беларускага семіятычна-культурнага коду (мовы, светапогляду, звычаяў), – засведчыў рэальную запатрабаванасць беларускага мастацкага слова. З другога боку, той факт, што беларусы ўваходзілі ў XX ст. без уласнай нацыянальнай эліты, без падрыхтаваных паводле стандартаў высокацывілізаванага грамадства аўтараў і рэцыпіентаў, прадвызначыў узровень і змястоўна-стылёвыя асаблівасці літаратурна-паэтычнай прадукцыі "нашаніўскага" перыяду. Паколькі беларускасць лакалізавалася выключна ў "нізкай" ("простай", "сялянскай", "нецывілізаванай", "побытавай") сацыяльна-культурнай прасторы, першыя ўзоры беларускамоўнай творчасці XX ст. (1905–1909 гг.) экспліцытна і імпліцытна неслі ў сабе прыкметы "прастасці", "штодзённасці", "сялянскасці" (рысы паэтыкі інсіта; выбудоўванне мастацкай камунікацыі (аўтар – твор – чытач) у межах дыялогу "пакрыўджаны (прыніжаны) – пакрыўджанаму" або "пакрыўджаны – крыўдзіцелю") [2; 3; 6; 11; 14].

2. Канфлікт і ўзаеманакладанне "высокага" ("цывілізаванага", "кніжнага") і "нізкага" ("побытавага", але даступнага нацыянальнаму чытачу пачатку XX ст.) яскрава выяўляюцца ў ранняй творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа. Прыход у беларускую паэзію Максіма Багдановіча (1909) – літаратара з выразным аналітыка-рэфлексіўным стаўленнем да творчай працы і прафесійным, заснаваным на сістэмнай адукацыі светапоглядам, – максімальна крышталізаваў унутраныя супярэчнасці, характэрныя для беларускай мастацка-паэтычнай прасторы канца першага дзесяцігоддзя XX ст. (імкненне да класічнай "высокасці" і, з іншага боку, неабходнасць адлюстроўваць і асэнсоўваць "нізкі" мастацкі аб'ект). З'яўленне М. Багдановіча пазначыла новы этап складвання нацыянальнага класічнага стылю, інтэнсіфікавала працэсы мадэрнізацыі, "ацывілізоўвання", універсалізацыі і "ўзвышэння" нацыянальнага паэтычнага слова, зрабіўшы незваротным распачаты Янкам Купалам і Якубам Коласам рух да культурнасці, прафесійнасці, агульначалавечай, а не лакальна-сялянскай, побытавай значнасці беларускага паэтычнага мастацтва.

Багдановіч праявіў высокую ступень творчага суверэнітэту, не падпарадкаваўся ціску сацыяльнага выкліку, свядома пайшоўшы насуперак абставінам (адсутнасць нацыянальнай інтэлігентнай аўдыторыі) і дэтэрмінаванаму імі "нашаніўскаму" шчыра-простаму фармату пісьма.

Наватарства М. Багдановіча як паэта звязанае не толькі з увагай да мастацка-тэхнічных асноў вершаскладання і праблем прыгожага ў творы (апазіцыя "сацыяльнасць – краса" занадта вузкая для расчытання "загадкі" Багдановіча), але з вывядзеннем беларускай паэтычнай мовы і мастацкага мыслення на прынцыпова новы ўзровень – універсальна-высокі, "кніжны", узорна-класічны. Творца яскрава рэпрэзентаваў у айчыннай паэзіі новую камунікатыўную перспектыву – агульначалавечую, сацыяльна не маркіраваную (у адрозненне ад ранейшай народніцка-сялянскай, з паэтыкай, гранічна набліжанай да "простага", сялянскага ўспрымання). Багдановічавы тэксты звернуты да "ідэальнага беларуса", беларуса будучыні – высокаадукаванага, "уключанага" ў культуру, роўнага сярод роўных. Такі падыход адкрыў якасна новыя магчымасці для індывідуалізацыі і інтэлектуалізацыі, псіхалагізацыі і лірызацыі беларускага паэтычнага слова. Да мадэлявання мастацкай прасторы паводле прынцыпаў камунікацыйнага і эстэтычнага універсалізму ўсё больш паслядоўна звяртаюцца напрыканцы 1900-х – пачатку 1910-х гг. Янка Купала і Якуб Колас, што спрыяе выкрышталізоўванню іх індывідуальных варыянтаў нацыянальнага класічнага стылю. Лінію агульначалавечасці вытрымлівае таксама Алесь Гарун [4; 6; 7; 10].

3. Дзейнасць Максіма Багдановіча як тэарэтыка і крытыка літаратуры заклала рацыянальна-аналітычны фундамент беларускай паэтычнай традыцыі, дала ёй трывалы паняццёва-ідэйны грунт. Багдановіч упершыню сфармуляваў прынцыповыя патрабаванні да паэта-прафесіянала і актуалізаваў у айчыннай паэтычнай прасторы сістэму крытэрыяў уласна эстэтычнай ацэнкі вершаваных твораў (аўтанамізацыя паэтычнага мастацтва), вызначыў праблемы і перспектывы развіцця нацыянальнага прыгожага пісьменства, зафіксаваўшы тым самым факт эстэтычнага самаўсведамлення беларускай паэзіі. Гэта мела выключнае значэнне для яе станаўлення як паўнавартаснай эстэтычнай сістэмы ў кантэксце агульнаеўрапейскага мастацкага працэсу. Літаратурна-тэарэтычная і крытычная спадчына М. Багдановіча выяўляе непарыўныя сувязі з яго творчай практыкай: па сутнасці, разам яны ўяўляюць сабой цэласную, дэталёва прапрацаваную ідэйна-эстэтычную праграму, скіраваную на развіццё нацыянальнай паэзіі і перманентнае падтрыманне за ёй статусу актыўнага суб'екта еўрапейскага літаратурнага жыцця (здольнасць уплываць на мысленне і духоўны стан сучаснага цывілізаванага чалавека). Праграмнасць, падкрэсленая мэтаскіраванасць дзейнасці – істотная адзнака Багдановіча –паэта і тэарэтыка літаратуры [1; 4; 7; 13].

4. Сутнаснае ядро Багдановічавай праграмы па развіцці нацыянальнай паэзіі складае канцэпцыя еўрапеізацыі беларускага паэтычнага мастацтва, заснаваная на такіх вузлавых філасофска-эстэтычных палажэннях, як: паэзія ёсць самакаштоўным духоўна-інтэлектуальным феноменам, сутнасць якога –

эстэтычная; верш адбываецца як мастацкая з'ява толькі ў тым выпадку, калі выяўляе "чыстую красу" (валодае адпаведным ідэйна-змястоўным напаўненнем і дасканалай формай, абавязкова фундаванымі псіхалагічна-інтэлектуальнай "асабовасцю" аўтара); высокая эстэтычная вартасць твора дасягаецца праз рацыянальнае, асэнсавана-ўдумлівае стаўленне да паэтычнай дзейнасці; рух, пошук новых формаў, тэмаў, жанраў – заклад захавання эстэтычна-творчай сутнасці паэзіі. Паводле М. Багдановіча, неабходнае пастаяннае суаднясенне з'яў нацыянальнай літаратуры са з'явамі іншанацыянальных літаратур, узаемаабмен і творчае спаборніцтва, а таксама "не-таптанне на месцы" – няспыннае самааднаўленне, самасцвярджэнне творчасці як творчасці, г. зн. феномена, што раскрывае сутнасць быцця, прымушае па-новаму бачыць свет і, адпаведна, здзяйсняецца толькі пры надзвычайнай духоўнай і разумова-эмацыйнай самааддачы аўтара і чытача. Ідэі паэта-тэарэтыка пра неабходнасць вывядзення беларускай паэзіі ў "вялікі свет" знайшлі шырокі і разнапланавы розгалас у літаратурна-крытычнай думцы "нашаніўскай" пары, у прыватнасці, у дыскусіі 1913–1914 гг. [1; 4; 5; 8; 12].

5. Ступень актуалізаванасці рэпрэзентаваных М. Багдановічам мастацка-анталагічных ідэй у творчай практыцы і аналітыка-крытычнай думцы аўтараў "нашаніўскай" пары акрэслівае этапы складвання нацыянальнага класічнага стылю:

— падрыхтоўчы (1905–1908 гг.), калі істотным было сродкамі беларускамоўнай вершатворчасці заявіць пра экзістэнцыйную прысутнасць беларусаў у свеце, праз збіранне пісьменніцкіх сіл і гуртаванне чытацкай аўдыторыі накапіць неабходную "крытычную масу"; айчыннае паэтычнае слова функцыянавала яшчэ шмат у чым як з'ява парапрафесійная, "несвядомая", стыхійна-мастацкая; сістэма ўласна эстэтычных крытэрыяў ацэнкі мастацкіх тэкстаў дзейнічала непаслядоўна і не ў поўнай ступені;

— цэнтральны (1909–1913 гг.), час якасных пераўтварэнняў у нацыянальнай паэтычнай прасторы, звязаных з прафесіяналізацыяй мастацкага мыслення, "ацывілізоўваннем", універсалізацыяй пісьма; дзякуючы дзейнасці М. Багдановіча-крытыка ўсталёўваецца сістэма строгіх эстэтычных крытэрыяў ацэнкі вартасці мастацкай прадукцыі, умацоўваецца эстэтыка-тэарэтычны фундамент нацыянальнай паэтычнай традыцыі; узровень айчыннага паэтычнага слова пачынае паслядоўна суадносіцца з "меркаю еўрапейскай";

— завяршальна-замацавальны (1914–1918 гг.), пачатак паўнацэннага, поўнапраяўленага функцыянавання нацыянальнай паэтычнай традыцыі, разгортванне інтэлектуальна-эстэтычных патэнцый беларускай класічнай паэзіі.

У паэтычнай і літаратурна-тэарэтычнай спадчыне М. Багдановіча закрануты анталагічныя асновы паэзіі як мастацтва, ускрыта спецыфіка існавання паэтычнага слова ва ўмовах дынамічнага, "патрабавальнага"

сучаснага свету. Паэт паўздзейнічаў на глыбінныя чыннікі, адказныя за вітальнасць беларускай прафесійнай паэзіі як такой. Усеахопнасць, інтэлектуальна-эстэтычная цэласнасць, грунтаванне на класічных ідэалах і разам з тым скіраванасць на перспектыву, творчая плюралістычнасць, пастуляванне магчымасці канструктыўнага адмаўлення зробленага папярэднікамі забяспечылі Багдановічавым ідэям пазачасавую, універсальна-гістарычную значнасць [1; 8; 9; 12; 13].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

Палажэнні даследавання могуць быць выкарыстаныя для далейшай распрацоўкі ў фундаментальнай літаратуразнаўчай навуцы праблемы эвалюцыі нацыянальнай паэтычнай традыцыі ў XX ст. Дысертацыя можа выступаць метадалагічнай базай пры параўнальна-тыпалагічным аналізе спадчыны паэтаў-класікаў, даследаванні крыніц станаўлення і змястоўна-стылёвых асаблівасцей нацыянальнай паэзіі, вывучэнні гісторыі чытача і чытацкай рэцэпцыі беларускага паэтычнага слова.

Атрыманыя навуковыя вынікі істотныя пры далейшым даследаванні шырокага кола багдановічазнаўчых пытанняў, у тым ліку – традыцый М. Багдановіча ў беларускай паэзіі XX – пачатку XXI ст. Прапанаваны ў дысертацыйнай працы падыход – разгляд спадчыны паэта як цэласнай ідэйна-эстэтычнай праграмы – дазваляе зірнуць на дасягнутае мастаком-тэарэтыкам не ў нейкім адным часавым зрэзе, а ў гістарычных рэтраспектыве і перспектыве. Калі выкарыстоўваць зробленыя ў даследаванні высновы пры непасрэдным аналізе ўплыву М. Багдановіча на таго ці іншага аўтара, можна пазбегнуць дробных і нярэдка малаплённых у навуковым плане пошукаў тэкставых паралеляў, забяспечыўшы тым самым якасную ацэнку ступені сутнаснай пераемнасці паміж Багдановічам і творцамі-наступнікамі (пэўныя напрацоўкі ў гэтым кірунку ўжо зробленыя дысертантам пры разглядзе ўплыву М. Багдановіча на дзейнасць літаратурнага аб'яднання "Узвышша" [5]).

Матэрыялы дысертацыі прыдатныя для выкарыстання ў адукацыйнай сферы – пры стварэнні вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў для вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, а таксама для ўключэння ў лекцыйныя і спецыяльныя курсы па гісторыі нацыянальнай літаратуры пачатку XX ст., вывучэнні творчасці пісьменнікаў "нашаніўскай" пары (Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, А. Гаруна, С. Палуяна, М. Гарэцкага, В. Ластоўскага, З. Бядулі і інш.).

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

## Навуковыя артыкулы ў рэцэнзаваных перыядычных выданнях


1 Вабішчэвіч, Т.І. Літаратурная традыцыя Максіма Багдановіча як ідэйна-эстэтычная праграма / Т.І. Вабішчэвіч // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2005. – № 4. – С. 105–109.

2 Вабішчэвіч, Т.І. Станаўленне беларускай класічнай паэзіі і праблема чытача / Т.І. Вабішчэвіч // Веснік Брэсцкага універсітэта. Сер. філалаг. навук. – 2005. – № 3. – С. 3–9.

3 Вабішчэвіч, Т.І. Аўтары-самавукі як заснавальнікі прафесійнай літаратуры: асаблівасці эстэтычнага асваення рэчаіснасці ў "нашаніўскай" паэзіі / Т.І. Вабішчэвіч // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2005. – № 5. Ч. 2. – С. 107–109.

4 Вабішчэвіч, Т.І. Максім Багдановіч і станаўленне нацыянальнай паэтычнай традыцыі: тэарэтыка-метадалагічныя аспекты / Т.І. Вабішчэвіч // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2006. – № 1. – С. 93–98.

5 Вабішчэвіч, Т.І. Максім Багдановіч і праграмныя палажэнні "Узвышша" / Т.І. Вабішчэвіч // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2006. – № 5. Ч. 1. – С. 112–115.


## Навуковыя артыкулы ў рэцэнзаваных зборніках


6 Вабішчэвіч, Т.І. Да вытокаў нацыянальнай літаратурнай традыцыі: мастацтва-insitus як субстрат класічнай паэзіі / Т.І. Вабішчэвіч // Сучаснае літаратуразнаўства: сістэма каштоўнасцей і прыярытэтаў: зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. ім. Я. Купалы; навук. рэд. В.А. Максімовіч. – Мінск: Беларус. навука, 2006. – С. 71–97.

7 Вабішчэвіч, Т.І. Эстэтычныя канцэпцыі Янкі Купалы, Якуба Коласа і Максіма Багдановіча ў літаратурна-крытычных працах Івана Навуменкі / Т.І. Вабішчэвіч // Творчая асоба І. Навуменкі і праблемы беларускай філалогіі і адукацыі: зб. навук. арт. / рэдкал.: Т.І. Шамякіна [і інш.]; уклад. А. Бельскі. – Мінск: РІВШ, 2006. – С. 192–199.


## Матэрыялы канферэнцый


8 Вабішчэвіч, Т.І. Канцэпцыя еўрапеізацыі беларускага мастацкага слова як асноватворны элемент літаратурнай традыцыі Максіма Багдановіча / Т.І. Вабішчэвіч // Зборнік дакладаў: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. "Я

не самотны, я кнігу маю…", да 90-годдзя адзінага прыжыццёвага зборніка вершаў М. Багдановіча "Вянок", Мінск, 8 снеж. 2003 г. / Літ. музей М. Багдановіча – Мінск, 2004. – С. 44–54.

9 Вабішчэвіч, Т.І. Праблема "чыстай красы" ў творчасці М. Багдановіча і Н. Арсенневай / Т.І. Вабішчэвіч // Актуальныя праблемы сучаснага літаратурнага працэсу: матэрыялы Рэспуб. навук. канф., Мінск, 31 мая 2004 г. / Ін-т літ. ім. Я. Купалы НАН Беларусі. – Мінск, 2005. – С. 46–50.

10 Вабішчэвіч, Т.І. Творчасць Якуба Коласа і Максіма Багдановіча і выпрацоўка змястоўна-стылёвых адметнасцяў беларускай паэзіі (на прыкладзе грамадзянскай і патрыятычнай лірыкі) / Т.І. Вабішчэвіч // Каласавіны: лёс пісьменніка – лёс народа: матэрыялы навук. канф., прысвечанай 60-годдзю вызвалення Беларусі ад ням.-фашысцкіх захопнікаў, Мінск, 3–4 лістап. 2004 г. / Дзярж. літ.-мемарыял. музей Якуба Коласа. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2005. – С. 127–133.

11 Вабішчэвіч, Т.І. Літаратурна-выдавецкая палітыка "Нашай нівы" і феномен інсітнай паэзіі / Т.І. Вабішчэвіч // Беларусь у эпоху рэвалюцыйных узрушэнняў: да 100-годдзя выхаду ў свет газеты "Наша ніва": матэрыялы Рэспуб. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 10 лістап. 2006 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал.: І.І. Багдановіч [і інш.]; навук. рэд. А.П. Жытко. – Мінск: БДПУ, 2006. – С. 34–39.

12 Вабішчэвіч, Т.І. Праблема еўрапеізацыі беларускай літаратуры ў "нашанiўскім" літаратурна-крытычным і публіцыстычным дыскурсе / Т.І. Вабішчэвіч // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні: зб. навук. прац, Гродна, 11–12 мая 2006 г. / Гродзен. дзярж. ун-т; пад рэд. У. Каялы. – Гродна: ГрДУ, 2006. – С. 100–107.

13 Вабішчэвіч, Т.І. Праблема прафесіяналізацыі нацыянальнага слоўнага мастацтва ў літаратурна-крытычных працах М. Багдановіча / Т.І. Вабішчэвіч // Максім Багдановіч – празаік, крытык, публіцыст: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 29 лістап. 2005 г. / Літ. музей М. Багдановіча; уклад. І.В. Мышкавец. – Мн.: РІВШ, 2006. – С. 15–22.

14 Вабішчэвіч, Т.І. Феномен канструктыўнай крытычнасці: Сяргей Палуян і беларуская літаратуразнаўчая думка / Т.І. Вабішчэвіч // Сучасны літаратурны працэс: пісьменнік і жыццё: матэрыялы Рэспуб. навук. канф., Мінск, 11 мая 2006 г. / Ін-т літ. ім. Я. Купалы НАН Беларусі. – Мінск: Беларус. навука, 2006. – С. 43–48.

# РЭЗЮМЭ

**Вабішчэвіч Таццяна Іванаўна**

## МАКСІМ БАГДАНОВІЧ І СТАНАЎЛЕННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЭТЫЧНАЙ ТРАДЫЦЫІ

**Ключавыя словы:** нацыянальная паэтычная традыцыя, класіка літаратурная, нацыянальны класічны стыль, змястоўна-стылёвыя рысы беларускай паэзіі, багдановічазнаўства, "нашаніўства", літаратура і грамадства, чытач, інсітная паэзія, прафесіяналізацыя беларускай літаратуры, эстэтычная самасвядомасць літаратуры, еўрапеізацыя беларускага паэтычнага слова.

**Мэта даследавання** – вызначыць ролю і месца комплексу літаратурна-тэарэтычных ідэй і творчых напрацовак Максіма Багдановіча ў станаўленні беларускай паэтычнай традыцыі як прафесійнай мастацкай сістэмы агульнацыянальнага і сусветнага значэння.

Дасягненне мэты забяспечваюць сістэмны падыход, канкрэтна-гістарычны, параўнальна-тыпалагічны і герменеўтычны метады даследавання.

**Навуковая навізна даследавання** заключаецца ў комплексным асэнсаванні ўздзеяння Максіма Багдановіча – практыка і тэарэтыка літаратуры – на працэсы афармлення беларускай паэзіі ў паўнавартасную прафесійна-мастацкую сістэму – самакаштоўны феномен духоўна-інтэлектуальнага жыцця нацыі і чалавецтва. Акрэслены ўмовы, механізмы і этапы складвання нацыянальнага класічнага стылю, асаблівасці мастацка-прафесійнага сталення айчыннай літаратуры. Паэтычная і літаратурна-крытычная спадчына М. Багдановіча прааналізаваныя як цэласная ідэйна-эстэтычная праграма, у якой вызначаны асноватворныя прынцыпы і каардынаты бытавання нацыянальнай паэзіі ў "вялікім часе". Раскрыта наватарства ідэй М. Багдановіча ў кантэксце "нашаніўскага" літаратурнага працэсу.

Вынікі работы актуальныя для далейшай распрацоўкі праблемы эвалюцыі нацыянальнай паэтычнай традыцыі, даследавання змястоўна-стылёвых асаблівасцей беларускай паэзіі, вывучэння шырокага кола багдановічазнаўчых пытанняў. Матэрыялы дысертацыі могуць выкарыстоўвацца пры стварэнні вучэбных дапаможнікаў, падрыхтоўцы лекцыйных курсаў па гісторыі беларускай літаратуры пачатку XX ст.

# РЕЗЮМЕ

**Вабищевич Татьяна Ивановна**

## МАКСИМ БОГДАНОВИЧ И СТАНОВЛЕНИЕ НАЦИОНАЛЬНОЙ ПОЭТИЧЕСКОЙ ТРАДИЦИИ

**Ключевые слова:** национальная поэтическая традиция, классика литературная, национальный классический стиль, содержательно-стилевые черты белорусской поэзии, богдановичеведение, "нашенивство", литература и общество, читатель, инситная поэзия, профессионализация белорусской литературы, эстетическое самосознание литературы, европеизация белорусского поэтического слова.

**Цель исследования** – определить место и роль комплекса литературно-теоретических идей и творческих наработок Максима Богдановича в становлении белорусской поэтической традиции как профессиональной художественной системы общенационального и мирового значения.

Достижение цели обеспечивают системный подход, конкретно-исторический, сравнительно-типологический и герменевтический методы исследования.

**Научная новизна исследования** заключается в комплексном осмыслении воздействия Максима Богдановича – практика и теоретика литературы – на процессы оформления белорусской поэзии в полноценную профессионально-художественную систему – самодостаточный феномен духовно-интеллектуальной жизни нации и человечества. Обозначены условия, механизмы и этапы формирования национального классического стиля, особенности художественно-профессионального роста отечественной литературы. Поэтическое и литературно-критическое наследие М. Богдановича проанализированы как целостная идейно-эстетическая программа, в которой определены основополагающие принципы и координаты бытования национальной поэзии в "большом времени". Раскрыто новаторство идей М. Богдановича в контексте "нашенивского" литературного процесса.

Результаты работы актуальны для дальнейшей разработки проблемы эволюции национальной поэтической традиции, изучения широкого круга богдановичеведческих вопросов. Материалы диссертации могут использоваться при создании учебных пособий, подготовке лекционных курсов по истории белорусской литературы начала XX в.

# SUMMARY

**Vabishchevich Tatsiana Ivanauna**

## MAKSIM BAHDANOVICH AND THE FORMATION OF NATIONAL POETIC TRADITION

**Key words:** national poetic tradition, literary classics, national classic style, content and style characteristics of Belarusian poetry, Bahdanovichiana, "Naša Niva" movement, literature and society, reader, insitus poetry, professiolization of Belarusian poetry, aesthetic self-consciousness of literature, Europeanization of Belarusian poetry.

**The aim of research** is to define the place and the role of Maksim Bahdanovich's aesthetic ideas and creation heritage in the formation of Belarusian poetic tradition as a professional artistic system with national and universal significance.

The system approach, concrete historical, comparative-typological and hermeneutical methods ensure the achievement of the aim.

**The scientific novelty of the research** consists in the complex comprehension of Bahdanovich's influence on the processes of Belarusian poetry development into the full-fledged professional artistic system – all-sufficient phenomenon of mental and intellectual life of nation and humanity. The conditions, mechanisms, phases and national peculiarities of the formation of national classical style are defined. Poetic and literary critical heritage of M. Bahdanovich is analysed as an integral ideologic and aesthetic programme for the development of national literature, where the basic principles of the Belarusian poetry functioning in the "great time" are named. The innovation of M. Bahdanovich's ideas in the context of "Naša Niva" literary process is shown.

The results of research are important for the further investigation of the evolution of national poetic tradition and the wide range of questions connected with Bahdanovich's heritage. The materials of the thesis can be also used in creation of new manuals and working out lectures on the history of Belarusian literature of the beginning of the XXth century.

Навуковае выданне
Вабішчэвіч Таццяна Іванаўна
Максім Багдановіч і станаўленне нацыянальнай паэтычнай традыцыі
Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

Падпісана ў друк 20.03.2007. Фармат 60x84 $^{1}/_{16.}$ Папера афсетная. Гарнітура . Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 1,36. Ул.-выд. арк . Тыраж 100 экз. Заказ №

ВТАА "Права і эканоміка". Ліцэнзія № 02330/0056831 ад 01.04.2004.
220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2.